**Абагульнім і запомнім.** У цяперашні час сфера паслуг развіваецца больш высокімі тэмпамі ў параўнанні са сферай вытворчасці. Вядучымі яе відамі эканамічнай дзейнасці з'яўляюцца гандаль, транспарт і інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі. Адны з відаў эканамічнай дзейнасці сферы паслуг, якія найбольш хутка развіваюцца, — інфармацыя і сувязь.

1. Па якім прынцыпе вылучаецца структура сферы паслуг? 2. Якія прадпрыемствы і ўстановы сферы паслуг Беларусі адносяцца да катэгорыі паўсядзённага попыту, а якія — перыядычнага? 3. Чаму гандаль мае высокую ўдзельную вагу ў ВУП краіны? 4. Чаму такімі хуткімі тэмпамі развіваюцца інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі?

5. Назавіце буйнейшыя гандлёвыя комплексы вашай мясцовасці і вызначце выгаднасць іх размяшчэння. 6. Чым тлумачацца структурныя змены сферы паслуг? 7. Якія новыя віды эканамічнай дзейнасці сферы паслуг узнікаюць у цяперашні час і якія могуць узнікнуць у бліжэйшы?

***Ад тэорыі да практыкі.*** У Беларусі і Латвіі ў 2021 г. пройдзе чэмпіянат свету па хакеі. Распрацуйце для Беларусі міні-праект па арганізацыі паслуг па часовым пражыванні і харчаванні для замежных турыстаў, якія наведаюць чэмпіянат свету па хакеі.

## § 41. Геаграфія навукова-адукацыйных і сацыяльных паслуг

***Узгадваем.*** *Якія ступені адукацыі вы ўжо прайшлі і якія плануеце пераадолець? Якія ўстановы культуры вы наведвалі?*

Важнай складовай часткай сацыяльнага комплексу паслуг з'яўляюцца навукова-адукацыйныя і сацыяльныя паслугі. Па ўдзельнай вазе ў аб'ёме платных паслуг яны істотна саступаюць гандлю і дзелавым паслугам, але інтэнсіўна развіваюцца ва ўмовах пераходу да постіндустрыяльнага грамадства. Уключаюць некалькі відаў эканамічнай дзейнасці: адукацыю, навуковую дзейнасць, ахову здароўя, культуру, спорт, турызм.

**Адукацыя.** Беларусь мае развітую сістэму адукацыі. Узровень пісьменнасці дарослага насельніцтва, паводле звестак перапісу 2009 г., складае 99,6 %, ахоп базавай, агульнай сярэдняй і прафесійнай адукацыяй занятага насельніцтва — 98 %. Па большасці паказчыкаў, колькасці студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі на 10 тыс. насельніцтва Беларусь знаходзіцца на ўзроўні развітых краін Еўропы. Установы адукацыі размешчаны раўнамерна па ўсёй краіне. Сістэма адукацыі ўключае ўстановы, якія дазваляюць рэалізоўваць адукацыйныя праграмы рознага ўзроўню (мал. 162).

**Установы адукацыі**

| | |
|---|---|
| Дашкольнай адукацыі | 3812 |
| Агульнай сярэдняй адукацыі | 3067 |
| Прафесійна-тэхнічнай адукацыі | 182 |
| Сярэдняй спецыяльнай адукацыі | 226 |
| Вышэйшай адукацыі | 51 |

Мал. 162. Асноўныя віды і колькасць устаноў адукацыі ў Беларусі, 2017 г.

Да *ўстаноў дашкольнай адукацыі* адносяцца яслі, яслі-сады, дзіцячыя сады, санаторныя яслі-сады і дзіцячыя сады, дашкольныя цэнтры развіцця дзіцяці, якія наведваюць больш за 75 % дзяцей дашкольнага ўзросту. Агульная колькасць устаноў у апошнія гады зменшылася і складае каля 3800. Колькасць дзяцей, якія наведваюць дашкольныя ўстановы, у апошнія гады расце і складае больш за 420 тыс. чалавек. Найбольшы ахоп дзяцей такімі ўстановамі ў Мінску.

Лідзіруюць па колькасці вучняў *установы агульнай сярэдняй адукацыі*. Да іх адносяцца пачатковыя, базавыя, сярэднія школы, гімназіі, ліцэі, суvoраўскія і кадэцкія вучылішчы, санаторныя школы-інтэрнаты, вучэбна-педагагічныя комплексы, колькасць якіх каля 3067. Налічваецца каля 250 гімназій і ліцэяў. Асаблівай папулярнасцю сярод тых, хто паступае, карыстаецца ліцэй БДУ. Агульная колькасць вучняў у краіне ў апошнія гады ўзрасла амаль да 995 тыс. чалавек. У школах укараняюцца інфармацыйныя тэхналогіі, абсталёўваюцца камп'ютарныя класы.

Да *ўстаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі* адносяцца прафесійныя і прафесійна-тэхнічныя ліцэі, каледжы і вучылішчы. Яны забяспечваюць падрыхтоўку кадраў па розных спецыяльнасцях. Размешчаны ўстановы раўнамерна па тэрыторыі Беларусі. У краіне каля 180 устаноў, трэцяя частка якіх мае сельскагаспадарчы профіль.

Спецыялістаў больш высокай кваліфікацыі рыхтуюць *установы сярэдняй спецыяльнай адукацыі*. Яны прадстаўлены 226 рознапрофільнымі каледжамі. Больш за ўсё (46) сярэдніх спецыяльных каледжаў у Мінску, дзе прадстаўлены амаль усе профілі каледжаў. Шмат каледжаў у Бабруйску і Магілёве. Каледжы размяшчаюцца пераважна ў гарадах, радзей — у сельскіх населеных пунктах.

Прааналізуйце карту атласа (с. 52) і знайдзіце ўстановы сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Назавіце прычыны такога размяшчэння.

Падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў у Беларусі ажыццяўляюць *установы вышэйшай адукацыі (УВА)*. Да іх адносяцца



Мал. 163. Будынак навучальнага корпуса геаграфічнага факультэта БДУ, г. Мінск

класічныя ўніверсітэты, профільныя ўніверсітэты (акадэміі і кансерваторыі), інстытуты і вышэйшыя каледжы. У цяперашні час у Беларусі 51 установа вышэйшай адукацыі, якія размешчаны ў 11 гарадах краіны. Яшчэ ў 5 гарадах падрыхтоўку спецыялістаў ажыццяўляюць філіялы УВА. Пераважная большасць устаноў адносіцца да класічных (Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (мал. 163), універсітэты ў Гомелі, Гродне, Брэсце, Магілёве, Віцебску, Наваполацку, Баранавічах) і профільных (БНТУ, БАТУ, БДПУ імя Максіма Танка і інш.) універсітэтаў. Больш за палову УВА краіны знаходзіцца ў Мінску. Колькасць студэнтаў ва ўстановах вышэйшай адукацыі — каля 280 тыс. Захоўваецца тэндэнцыя апошніх гадоў да скарачэння колькасці студэнтаў. У 2017 г. на 10 тыс. насельніцтва ў Беларусі прыходзілася 300 студэнтаў, што з'яўляецца высокім паказчыкам сярод краін Еўропы. УВА краіны штогод прымае на вучобу каля 15 тыс. замежных студэнтаў, што з'яўляецца сведчаннем высокага ўзроўню адукацыі ў Беларусі. БДУ уваходзіць у 1000 лепшых універсітэтаў свету і займае 2-е месца ў СНД.

З адукацыяй цесна звязаны *навуковыя даследаванні* і *інавацыі*. У цяперашні час навуковымі даследаваннямі займаюцца больш за 26 тыс. чалавек з 440 арганізацый. Пераважная большасць навуковых арганізацый знаходзіцца ў Мінску. Найбуйнейшым цэнтрам навуковых даследаванняў у краіне з'яўляецца Нацыянальная акадэмія навук Беларусі. Навуковая работа таксама праводзіцца ўстановамі вышэйшай адукацыі, шэрагам профільных навукова-даследчых інстытутаў, створаных пры розных міністэрствах і ведамствах. Доля навукаёмістых галін эканомікі ў ВУП у апошнія гады павышаецца і складае 36 %.

**Ахова здароўя.** Важным відам эканамічнай дзейнасці сферы паслуг з'яўляецца ахова здароўя. Удзельная вага аховы здароўя і сацыяльных паслуг складае больш за 3 % ВУП.

Медыцынская дапамога аказваецца ўстановамі аховы здароўя, якія можна падзяліць на групы. У першую групу ўваходзяць установы рэспубліканскага ўзроўню: медыцынскія НДІ, спецыялізаваныя клінікі, медыцынскія цэнтры, якія аказваюць высокатэхналагічныя віды медыцынскіх паслуг. Размяшчаюцца яны ў асноўным у Мінску і паблізу яго, а таксама ў абласных гарадах. Другую групу складаюць спецыялізаваныя дыспансеры, бальніцы, дыягнастычныя цэнтры, якія знаходзяцца ў буйных гарадах. У трэцюю групу ўвайшлі паліклінікі, бальніцы, дыспансеры,

радзільныя дамы, амбулаторыі, станцыі хуткай дапамогі, прафілактычныя і дыягнастычныя цэнтры і г. д. Яны знаходзяцца ў гарадах і ў сельскай мясцовасці. Асобную групу ўтвараюць санаторна-курортныя ўстановы, якія аказваюць медыцынскія паслугі аздараўленчага і прафілактычнага напрамку. Забяспечанасць насельніцтва паслугамі аховы здароўя ў Беларусі вышэйшая, чым у многіх краінах. Функцыянуе больш за 620 бальнічных арганізацый і больш за 2300 амбулаторый і паліклінік (мал. 164). У аказанні медыцынскіх паслуг удзельнічаюць больш за 40 тыс. дактароў і каля 120 тыс. працаўнікоў сярэдняга медыцынскага персаналу.



Мал. 164. 2-я гарадская клінічная бальніца г. Мінск

Дзякуючы клопату дзяржавы, установы аховы здароўя аснашчаны сучасным абсталяваннем. У Беларусі паспяхова функцыянуюць рэспубліканскія навукова-практычныя цэнтры, якія шырока вядомыя ва ўсім свеце: трансплантацыі органаў і тканак, «Кардыялогія», неўралогіі і нейрахірургіі, «Маці і дзіця» і інш. Цэнтры аказваюць медыцынскія паслугі як грамадзянам Беларусі, так і замежнікам, што пацвярджае высокі ўзровень медыцыны ў краіне.

**Турызм.** Вялікае значэнне ў сферы паслуг мае *турызм* і *адпачынак*. Гэта адзін з новых і перспектыўных відаў эканамічнай дзейнасці, які цесна ўзаемадзейнічае з аховай здароўя, фізкультурай і спортам, установамі культуры і іншымі відамі эканамічнай дзейнасці сферы паслуг. У Беларусі функцыянуе амаль 1450 арганізацый, якія займаюцца турысцкай дзейнасцю. Іх колькасць і прадастаўляемы аб'ём паслуг штогод павялічваюцца. Больш за палову гэтых арганізацый размешчана ў Мінску, астатнія даволі раўнамерна прадстаўлены па рэгіёнах краіны.

Турызм падзяляецца на ўязны і выязны. Пастаянна ўзрастае колькасць замежных турыстаў, якія наведалі Рэспубліку Беларусь, у тым ліку і дзякуючы ўвядзенню бязвізавага ўезду ў нашу краіну. У 2017 г. іх колькасць перавысіла 280 тыс. чалавек. Але пры гэтым захоўваецца больш чым двухразовае перавышэнне колькасці турыстаў, якія выехалі з краіны, над турыстамі, якія наведалі Беларусь. Амаль да 500 вырасла колькасць санаторна-аздараўленчых устаноў у Беларусі, да 590 — колькасць гасцініц і гасцінічных комплексаў. Паспяхова развіваецца аграэкатурызм, узрастае роля медыцынскага турызму. У адпаведнасці з інтэнсіўнасцю і аб'ёмам турысцкіх патокаў у Беларусі праведзена турысцка-рэкрэацыйнае раяніраванне і вылучаны чатыры турысцкія раёны і 20 мікрараёнаў. Амаль палова турысцкіх паслуг прыходзіцца на Цэнтральны турысцкі раён.

Прааналізуйце карту атласа (с. 55) і растлумачце інтэнсіўнасць турысцкіх патокаў у мікрараёнах.

У краіне надаецца вялікая ўвага развіццю *фізічнай культуры і спорту*. Гэты від паслуг неабходны для падтрымання здаровага ладу жыцця. Функцыянуе каля 23 300 спартыўных аб'ектаў і збудаванняў. Сярод іх спартыўныя залы, плавальныя басейны, вяслярныя каналы, велатрэкі, стадыёны, манежы і іншыя аб'екты. Такія спартыўныя збудаванні, як «Мінск-Арэна», «Чыжоўка-Арэна», гарналыжныя комплексы «Сілічы» і «Лагойск», рэспубліканскія цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі «Раўбічы», «Стайкі», «Ратамка» і іншыя, пастаянна прымаюць буйныя спартыўныя спаборніцтвы, вядомыя далёка за межамі краіны. На самым высокім узроўні ў Беларусі праводзяцца чэмпіянаты свету і Еўропы па хакеі, фігурным катанні, біятлоне і іншых відах спорту.

Вялікае значэнне ў сферы сацыяльных паслуг маюць культура і мастацтва. Прааналізуйце карту атласа (ст. 54) і вызначце размяшчэнне тэатраў, музеяў і іншых устаноў культуры па тэрыторыі Беларусі.

**Абагульнім і запомнім.** Адукацыя і ахова здароўя з'яўляюцца вядучымі відамі эканамічнай дзейнасці навукова-адукацыйных і сацыяльных паслуг і маюць сетку ўстаноў, распаўсюджаных па ўсёй краіне. Большасць устаноў навукі і культуры размешчаны ў буйных гарадах краіны.

1. На якія групы падзяляюцца ўстановы адукацыі і аховы здароўя? 2. Чаму турызм з'яўляецца адным з перспектыўных відаў эканамічнай дзейнасці?

3. Прааналізуйце карту атласа і растлумачце асаблівасці размяшчэння ўстаноў вышэйшай адукацыі. 4. Растлумачце, якім чынам установы аховы здароўя, фізкультуры і спорту, турызму ўдзельнічаюць у павышэнні якасці жыцця жыхароў Беларусі.

***Ад тэорыі да практыкі.*** Да сацыяльных паслуг адносяцца паслугі ўстаноў культуры. Распрацуйце для турыстаў рэкламны буклет, на якім адлюструйце інфармацыю пра найбольш значныя, на ваш погляд, установы культуры краіны (ці вашага населенага пункта).

## § 42. Геаграфія транспарту

***Узгадваем.*** *Для чаго выкарыстоўваецца транспарт? Якія віды транспарту вы ведаеце?*

**Фарміраванне і развіццё транспартнай сеткі.** У працэсе гістарычнага развіцця ўзнікае неабходнасць ажыццяўляць абмен таварамі, перамяшчаць розныя грузы. У кожнай краіне развіваецца транспарт як адзін з вядучых відаў эканамічнай дзейнасці сферы паслуг. Транспарт забяспечвае перавозку пасажыраў і грузаў з аднаго рэгіёна ў іншы, тым самым падтрымлівае